Адбылася цырымонія афіцыйнага гашэння мастацкага маркіраванага канверта «25-годдзе Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай мытняў і мытні «Мінск-2»

Сёння, 29 траўня 2018 года, у Дзяржаўным мытным камітэце Рэспублікі Беларусь адбылася цырымонія афіцыйнага гашэння мастацкага маркіраванага канверта «25-годдзе Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай мытняў і мытні «Мінск-2».

У аснове спецыяльнага штэмпеля - эмблема мытных органаў Рэспублікі Беларусь, на канверце - эмблемы Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай мытняў і мытні «Мінск-2». Дызайн Таццяны Кавалёвай.

У цырымоніі афіцыйнага гашэння прынялі ўдзел:

- Міністр сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Пятровіч Папкоў;
- Старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь Юрый Аляксеевіч Сянько.

У 2018 году 25 гадоў адзначаюць Віцебская, Гомельская, Магілёўская мытні і мытня «Мінск-2».

Source URL: *https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/29-05-2018-3160*